Hety Nr. „Bieł. Krynicy“ z dadatkam „Praleski“.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

Cana 10 hr.

Nr. 26 (667). Wilnia, Niadziela 31 Traŭnia 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Хаўтуры спраўляюць Беларусам

Многім польскім нацыяналістым беларускі народ не дае спаць. Дзень і ноч яны ўсё думаюць — гадаюць аб беларускай праблеме. Як беларускі народ перавесьці на палякоў, пісаў нядаўна нейкі Гертіх, а вось цяпер аб гэтым самым загаварыў нейкі Вайцех Васютыньскі ў сваей брашуры: «Zagadnienie Ziem Wschodnich» (Warszawa, 1936, nakładem «Ruchu Młodych»). Брашура гэта дае рэцэпт на апалячаньне і беларусаў і украінцаў. Агульны зьмест яе, што датыча беларусаў, выглядае гэтак:

— Усходнія землі сучаснай польскай дзяржавы ня твораць аднэй справы, аднаго пытаньня. Палякі гэтыя землі беспадстаўна называюць агулам «крэсамі». Прадусім трэба тут браць пад увагу падставу моўную. Няпольскае насельніцтва на паўдзень ад Прыпеці гавора мовай украінскай, а на поўнач, з выняткам вузкага моўнага пояса так зв. Чорнай Русі, пабеларуску. Сілай разбураючай зьяўляецца тут камунізм і ёсьць гэта ў сапраўднасьці новы нацыяналізм СССР. Тыя беларусы, што не паддаюцца полёнізацыі і ня ёсьць пасыўнымі, жадаюць належыць да БССР, як часткі СССР. Справа беларускіх зямель, гэта пагранічная польска-савецкая справа. Абходзіць яна толькі гэтыя дзьве дзяржавы і ня мае падстаў, каб вырасьці на справу міжнародную.

Тып беларуса ў Польшчы паўстаў з мешаніны этнічных элемэнтаў: літоўскага, польскага й украінскага. Беларусы не працівіліся маскоўскай тэорыі, што «рускі» народ складаецца з трох этнічных членаў: вялікарусаў, маларусаў і беларусаў.

Беларуская мова — гэта ня мова, а тыповая пераходная гутарка з польскімі ці маскоўскімі ўплывамі. Бальшавікі, што спыняюць развой культурнай самастойнасьці Украіны, на Беларусі пайшлі на якнайшырэйшае тварэньне беларускай мовы й літаратуры.

Пад узглядам грамадзкім беларусы маюць толькі сялян. Іншыя слаі насельніцтва — жыдоўскія, маскоўскія, польскія. У Савецкай Беларусі бальшавікі стварылі камуністычную інтэлігенцыю, што гавора пабеларуску, але гэта верныя Маскве камуністы і належаць да «нацыі СССР». У Польшчы беларускай інтэлігенцыі ня многа.

Палітычна беларусы так-жа слабыя. Найбольшай сілай між беларускім насельніцтвам ёсьць КПЗБ. Ёсьць яшчэ БНА, але гэта партыя палітычна нясільная.

Словам, беларусы гэта не народ. Яны не зьяўляюцца поўным грамадзкім арганізмам. Палітычна яны хінуцца або да Польшчы, або да СССР. Нацыянальная сьведамасьць, самастойная культура, гістарычнае мінулае бадай што ня існуюць. Прызнаваць беларусаў народам, або памагаць ім, каб яны выдзеліліся як народ, гэта доктрынэрства, гэта ўрэшце жэртваваньне для дактрыны будучыні польскага народу. Палякі маюць права й абавязак даць беларусам сваю вышэйшую і лепшую культуру і прызнаць іх за поўнапраўную часьціну польскага народу.

Для гэтай мэты трэба: Высьцерагацца барацьбы з беларускай мовай, асабліва ў школьніцтве. Навука павінна пачынацца ў мясцовай мове, але польскім правапісам і лацінскай азбукай. А пасьля, у меру развою дзіцяці, трэба пераходзіць да польскай літаратурнай мовы. Не апірацца на дварох, як на галоўных асяродках польскасьці, бо двары й сэквэстратары беларусаў ад Польшчы адстрашаюць. Мясцовым сялянам трэба даць зямлю, а з далейшых аколіц прывозіць асаднікаў толькі пасьля. Калёнізацыю трэба ўважаць за памылковую. Яна не зарадзіць перанасяленьню Польшчы і ня створыць сярод беларусаў польскай перавагі. Затое калёнізацыя выклікае проціпольскі рух. Стварыць на беларускіх землях у Польшчы проціжыдоўскі і проціканумістычны фронт. Стварыць агульна-дзяржаўную палітычную арганізацыю, у якую прымаліся-б і праваслаўныя й каталікі. На чале выхаваньня беларусаў паставіць духавенства армянскага абраду, каб завесьці новую унію, незьвязаную з львоўскай украінскай уніяй. —

Гэткі больш-менш Вайцеха Васютыньскага пагляд на беларускі народ, на яго культурныя й палітычныя імкненьні і гэткія сродкі яго спольшчаньня.

Вось-жа праўда, гадоў таму яшчэ якіх трыццаць, гэтак глядзець на беларусаў, як глядзіць на іх Васютыньскі, было рэчай больш-менш магчымай, але сяньня — гэта або звычайнае няведаньне справы, або злая воля. Аб тым, што беларускі народ асобная нацыя, сяньня ў навуцы ўжо спрэчкі няма. Сяньня гэтаму пярэчаць толькі звычайныя польскія або маскоўскія імпэрыялісты.

Да мінуўшчыны так-жа належа ўжо і ўсё тое, што В. Васютыньскі тлумача аб сучасным культурным, грамадзка-палітычным стане беларускага народу і аб яго нацыянальных імкненьнях. Пэўне, ёсьць яшчэ сям-там, як на той, так і на гэты бок савецка-польскай граніцы асяродкі, дзе беларусы — гэта хістлявая нясьведамая маса, але агулам беларускі народ ужо сапраўды сьведамы і сваей нацыянальнай асобнасьці і сьведамы сваіх культурных і палітычных правоў, а так-жа, пакольні на гэта пазваляюць палітычныя варункі, у якіх ён жыве, выяўляе і сваю волю ў кірунку свайго самастойнага агулам нацыянальнага жыцьця. Іншая рэч, што можам з прыемнасьцю сьцьвердзіць, што ў беларускім народзе сапраўды няма ніякіх заборчых, зьвярына-нацыяналістычных імкненьняў. Беларусы — гэта прыродныя сапраўдныя дэмократы.

Спосабы, урэшце, апалячэньня беларусаў, якія падае Васютынскі, можна падзяліць на дзьве групы: на нэгатыўныя і на пазытыўныя. У першых ён радзіць, чаго не рабіць, каб не адстрашаць беларусаў ад Польшчы. Вось-жа з гэтымі парадамі, паскольні яны ня толькі прывучаюць да польшчыны, але і бяруць пад увагу беларускае права, можна часткова пагадзіцца, тымбольш, што, на наш пагляд, лапінка рашучай ролі ў полёнізацыі адыграць ня можа, як, пэўне-ж, не зашкодзіць беларусам і надзяленьне іх зямлёй з мэтай прывучэньня да Польшчы.

Што-ж урэшце датыча сродкаў асыміляцыйных пазытыўных, паданых Васютыньскім, дык іх, асабліва гэны аб новай уніі... ў армянскім абрадзе, сьмела можна залічыць да звычайнай фантазіі. Гэныя ўсе сродкі беларусам ня страшны. Яны дадуць сабе з імі раду.

Словам, В. Васютыньскі хаўтуры беларусам спраўляе, а народ гэты жыве, мацуецца, вымаўляе сваім суседзям свае крыўды, прыпамінае аб сваіх правох, твора сваю культуру і пераможна йдзе да сьветлага свайго заўтра. Дарма, пане Васютынскі, па жывым ды хаўтуры спраўляць!...

Рэзалюцыя Беларускага Нацыянальнага Камітэту

ў Вільні, прынятая на Агульным Сходзе дня 10.V.1936 г.

Агульны Сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні сьцьвярджае, што выражанае ў рэзалюцыях Беларускага Нацыянальнага Камітэту 12.V.1935 г., 23.V.1934 г., 5.VII.1933 г. і папярэдніх гадоў палітычнае, соцыяльна-гаспадарчае і культурнае палажэньне Беларускага Народу за апошні год на лепшае не зьмянілася і надалей ёсьць аднолькава цяжкім па абодва бакі Рыскае мяжы, а таксама і ў іншых краёх, дзе Беларусы жывуць суцэльнай масай.

Прыймаючы гэта пад увагу, Агульны Сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні дае наказ свайму выканаўчаму органу — Прэзыдыуму БНК-ту, як прадстаўніку агульна-беларускай нацыянальнай думкі, далей праводзіць беларускую радыкальна-дэмократычную і нацыянальна — незалежніцкую палітыку, ідучы да ідэалу, выражанага ў акце 25 сакавіка 1918 г.

Пры гэтым Беларускі Нацыянальны Камітэт заклікае ўсё сьведамае беларускае грамадзянства і ўсе беларускія арганізацыі стварыць супольны фронт дзеля праводжаньня нацыянальна-беларускага ўсьведамленьня і беларускай школьнай акцыі ў бягучым 1936 г.

За Агульны Сход: Прэзыдыум Бел. Нацыянальнага Камітэту

(—) *Інж. А. Клімовіч*
Старшыня

(—) *Інж. Л. Дубейкаўскі*
І-шы Віцэ-Старшыня

(—) *Мгр. М. Шкялёнак*
ІІ-гі Віцэ-Старшыня

(—) *Др. Ст. Грынкевіч*
Скарбнік

(—) *Я. Пазьняк*
Сакратар.

Аб беларуска-украінскіх адносінах

Калі заглянем у сваю гісторыю, то пабачым, што жыцьцё Беларускага народу здавён-даўных цесна вязалася з жыцьцём суседняга нам народу Украінскага. Лёсы Беларусі і Украіны нейкім дзіўным спосабам зьбягаліся разам. Праўда, Украінцы, як народ большы, гарачэйшы, апярэдзілі Беларусаў у працы над адраджэньнем сваей Бацькаўшчыны, і ім да мэты ўжо недалёка, аднак агулам бяручы, трэба сказаць, што палажэньне Украіны мела менш трагічнае ад Беларусі.

Гледзячы на ўсё гэта здавалася-б што беларуска-украінскія адносіны павінны былі-б быць больш як сардэчныя. Тымчасам аднак, нажаль, ня можна іх назваць гэтак. Бо напр., самі украінцы пішуць, што ў іх на Беларусь часта махаюць рукою, гаворачы: „Яка там Білорусь!“ З другой узноў стараны і сярод беларусаў ёсьць такія людзі, якія таксама розныя рэчы выгаварваюць на Украінцаў, а нават была такая газэта, што проціў Украіны выступала адкрыта. Праўда, газэта гэта ня была беларускай у поўным значэньні гэтага слова, аднак сам факт яе існаваньня дужа вымоўны...

Ці можна аднак-жа сказаць, што беларуска-украінскія адносіны былі на благім шляху? — Вось-жа і гэтак сказаць ня можна. Бо фактычна адносіны гэтыя былі і ёсьць на добрым шляху, толькі можа замала што робіцца дзеля іх зацясьнянья, — асабліва-ж у апошнія гады. Бо калі возьмем гады ранейшыя, дык у гэным кірунку вялася праца. Так напр. пасьля таго, як Беларусы і Украінцы тварылі разам з іншымі нацыянальнымі меншасьцямі Польшчы блёк дзеля выбараў у Сойм і Сэнат, былі выданы супольна украінцамі, літоўцамі і беларусамі часапіс „Natio", прызначаны для інфармаваньня польскага грамадзянства і заграніцы аб жыцьці гэтых трох народаў у Польскай Дзяржаве. Было таксама цеснае супрацоўніцтва беларусаў з украінцамі на грунце польскага Сойму і Сэнату, а пры тым, украінскія пaслы адведвалі беларусаў, а беларускія украінцаў і г. д. У 1929 годзе ў Варшаве адбылася нават супольная беларуска-украінска-літоўская канфэрэнцыя ў якой прыймалі ўчасьце прадстаўнікі самых найбольшых палітычных арганізацыяў гэтых народаў у Польскай Рэспубліцы. Канфэрэнцыя гэна прыняла тады пастанову: „Пачаць цясьнейшае супрацоўніцтва ў бязупыннай барацьбе за правы сваіх народаў".

Ад таго часу мінула ўжо 6 з лішнім гадоў, аднак ня відаць пакульшто, каб зацясьнянья супрацоўніцтва названых трох народаў адбывалася. А трэба сказаць, што яно дужа патрэбнае і што яго вымагае сучаснае палажэньне, як Беларусаў, так Літоўцаў, так і Украінцаў.

Гаворачы аб украінска-беларускіх адносінах, нельга, ясна, абмінуць прэсы, якая тут бязумоўна адыгрывае аграмадную роль.

Вось-жа, калі ходзіць аб беларускую незалежніцкую прэсу, то трэба сьцьвердзіць, што яна украінскай справе пасьвячала належнае месца і заўсёды прыхільна да яе адносілася. З украінскае прэсы прыхільна да беларускае справы адносілася паважная штодзенная газэта „Новий Час", які ў мін. годзе ў перадавым артыкуле бараніў нават Беларусаў ад тэорыі нямецкага журналіста Коіца, каторая варажыла нам будучыню вельмі няпрыемную. А сёлета ў № 5 „Н. Ч." у артыкуле аб Міхасю Машары, чытаем такое параўнаньне: што Машара з сваім вялікім талентам, знаходзячыся ў жудасных жыцьцёвых варунках, недаючых ягонаму таленту магчымасьці развою, зьяўляецца сымбалем сучаснай Беларусі, якая магла-б разгарнуць усе свае багацтва, калі-б іншае было палажэньне.

Прыемны для Беларусаў артыкул, з ілюстрацыямі, ведамага украінскага паэта і журналіста А. Курдыдыка аб Беларускім Музэі ў Вільні знаходзім у № 2 навуковапапулярнага месячніка „Життя і Знання". Вельмі-ж прыхільны артыкул таго-ж А. Курдыдыка знаходзім так-жа ў № 1 вялікага і паважнага палітычнага журналу — „Шлях Націі", у якім А. К., сказаўшы горкую праўду сваім братом, заклікае украінскае грамадзянства да супрацоўніцтва з Беларусамі.

Весткі з беларускага жыцьця у прыхільным насьвятленьні зьмяшчаў час. „Батьківщина" рэдагаваны ведамым украінскім дзеячом Д. Паліявым, а часам і іншыя украінскія часапісы.

Здаўна і асабліва прыхільна адносіцца і адносіцца да Беларусаў паважны і вялікі ілюстраваны тыднёвы часапіс „Неділя", у № 16 якога сёлета, напрыклад, зьмешчаны вялікі артыкул аб Янку Купале, з ягонай падабізнай, з такім заканчэньнем: „...Пара ўжо даўно вывучыць і завязаць дружныя зносіны з Беларусьсю, што калісь будзе суседкай нашай заўтрашняй, іншай як сяньня Бацькаўшчыны". Узноўжа ў № 19 „Неділі" знаходзім агляд дзейнасьці Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, прычым агляд гэны так закончаны: „Мы падалі гэтыя весткі каб зар'ентаваць нашых Чытачоў, як цяжкая культурная праца братоў Беларусаў і як яны ўсё-ж-такі працуюць. Шчасьця ім Божа..." — Гэтых пару слоў даволі хіба будзе, каб пазнаць, як прыхільнае становішча займае адносна Беларусаў „Неділя".

Папрыяцельску аднёсься да нас Беларусаў так жа афіцыяльны орган Украінскага Нацыянальна-ДэмократычнагаАб'яднаньня(УНДО) „Свобода", каторы ў № 3 сёлета, між іншым, так пісаў:

„Так, хоць ніхто афіцыяльна ў Польшчы аб беларусах не ўспамінае, беларусы жывуць. Пад сваім бела-чырвона-белым сьцягам з гэрбам „Пагоня", на ём яны арганізуюць і будуюць сваё жыцьцё. і хоць з прычыны жудасных варункаў жыцьцё іх пакульшто дужа скромнае — так, як скажам 50 гадоў таму ў нас — то аднак будучыня перад беларусамі ясная. Бо няма сілы, якая-б прабудженых да дзяржаўнага жыцьця 25 сакавіка 1918 году народ зьлiквідавала-б".

Так, з свае стараны можам яшчэ запэўніць паважанага аўтара гэтых слоў — Остапа Далёкага — што ён не памыліўся. Будучыня Беларусі, так як і Украіны, ясная. Сучаснае палажэньне Беларусаў са праўды жудаснае, але яно яшчэ больш пабуджае беларускі народ да змагання за свой найвышэйшы ідэал. Ворагі-ж Беларусі тыя самыя, што і Украіны, дык і да барацьбы з імі, як Беларусам так і Украінцам трэба йсьці супольным фронтам, памятаючы што ў еднасьці сіла.

Дык-жа бліжэй, ды хутчэй да цясьнейшых, да лепшых адносінаў. Ад слоў-жа ідзем да беларуска-украінскага, а так-жа да украінска-беларуска-літоўскага супрацоўніцтва, адхіляючы цяпер на бок усё тое, штоб магло гэтыя народы разьеднываць. Бо вымагае гэтага, як ужо было сказана, дабро справы і сучаснае палажэньне і Беларусаў і Украінцаў і Літоўцаў. — Прэса-ж у гэтай справе павінна сьвяціць прыкладам. **Я. Н.**

U 10-ja UHODKI ŚMIERCI K. SWAJAKA

(zamiest wianka na mahiłu).

Ja pryjšoŭ tut tabie pakłanicca,
Rana zmoŭkły naš słaŭny paet,
Ad wakolicaŭ rodnaj ziamlicy
Prynašu tabie cichi prywiet.

Mnoha dzion biez ciabie pierażyta,
Mnoha projdziena roznych darog,
Mnoha raz kałasiłasia żyta
Na taboj apiawanych paloch.

Mnoha bora, niadoli, żniawiery
Pieranios naš pracoŭny narod
I ciażki, i tumanny i šery
Našych budniaŭ życciowych pachod.

Mnoha raz pakłanialisia soncu,
Tamu „Uzbornamu soncu" twajmu,
I išli pa staptanaj staroncy
Praklinajučy dolu swaju.

Dy żywie mocny duch u narodzie,
Z nowaj wieraj żywie maładniak,
I dalej my idziom u pachodzie
Biez ciabie užo, naš słaŭny Swajak.

Choć ty zmoŭk... I choć lira raźbita,
I choć nowyja straty bałać, —
Nad Krainaj, tumanam spawitaj,
Twaich pieśniaŭ akordy żwiniać.

Ja pryjšoŭ tut tabie pakłanicca,
Rana zmoŭkły zmahar i paet, —
Chaj tabie son światlany pryśnicca,
I ad rodnaj krainy prywiet!

M. Mašara.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Памятнік Каз. Сваяку ўжо пастаўлены. Стараньнем адумыслова га Сьвяткавальнага Камітэту 10-тых угодкаў сьмерці Каз. Сваяка — Кс. Кастантага Стэповіча ўжо пастаўлены быў анагдай памятнік на магіле паэта, на віленскіх могілках Росса. Памятнік выканала мясцовая каменярская фірма А. Бараноўскай. Выкананы памятнік, згодна з воляй нябожчыка, у форме вялікай на палову ляжачай гранітнай пліты, якая запушчана ў глыбокі фундамэнт з жэльбэтону. На выпалераваным баку пліты, з залочаных літараў уложаны надпіс:

šv. † p.
KAZIMIER SVAJAK
— Ks. Kastanty Stepovič —
paet
19.II.1890 — 6.V.1926

„Idzie voś jasnaja para,
Pravidu śviecić nam zara,
Ajčyna-Maci-Biełaruś,
Haroj, Žyva!..."
„Maja Lira."
(Znak Liry).

Магіла агароджана жалезнымі пацынаванымі прутамі, запушчанымі ў чатыры гранітныя слупы. Агародка абыймае і налева паложаную магілу паэтавага брата Альбіна, памёршага ў 1934 г.

Міхась Машара.

Лёгкі хлеб.

6)

Драма ў трох актах, з жыцьця вясковай моладзі.

Зьява 9.

Альжбета адна.

Альжбета — Ах, Божачка! Як-жа гэта!.. Як-жа гэта магло здарыцца?

Глядзела.. Так глядзела! З вачэй ня спускала! Здаецца толькі кніжкі чыталі. Вось і дачыталіся! Вось чаму яна плакала... А я старая дурань і ня сьцяміла. Праўду кажуць людзі, калі Бог захоча скараць, дык розум адбярэ (*стаіць апусьціўшы рукі*). А што-ж будзе, як стары даведаецца? Ён-жа яе жывой з рук ня выпусьціць.. Ён-жа яе з сьвету збавіць!

— Вы, кажа, мама не аддавае мяне за яго, а яна кажа, ад яго... Аж страх бярэ... На'т выгаварыць гэтага не магу, а яна так і сказала, проста і сказала. Ах, Божа, што пачаць? Тут прасіць трэба, трэба кланяцца, рукі цалаваць; каб ня кінуў... Каб ня кінуў на ганьбу! На паняверку людзкую! А стары яшчэ нос задзірае! Гутарыць ня хоча... Загутарыш! Яшчэ як загутарыш... Што пачаць? Так-жа ня можна, ня можна! Сказаць усё старому?... Ён-жа заб'е яе пасьля гэтага, а не аддасьць яму (*зноў думае*). Адно і асталося, — украсьці у старога грошы, ды выправіць іх... хай крадуцца... Другой радачкі няма! Цяпер мо' і красьці не захочаць. Раскажа Язэп, як стары лаяў яго?

Зьява 10-я.

Альжбета і Крукоўскі.

Крукоўскі — (*уходзячы*) Добры вечар! Пані адна? Як здароўе (*цалуе руку*). А дзе Верачка?

Альжбета — Пан Крукоўскі, што вы нарабілі? Я вас так любіла, так паважала.. Лічыла вас за сумленнага чалавека, а вы? а вы?.. ці-ж так можна?

Крукоўскі — А што? Што такое, маша?

Альжбета — Кіньце прыкідывацца! Мне ўсё ведама...

Крукоўскі — А ці мая віна, што пан Лявон ня прыняў маіх сватоў?

Альжбета — Лявон нічога ня ведае, ды і добра; бо інакчай не здабраваць нам усім.

Крукоўскі — Вы, мамаша, мяне ня пужайце. Я — былы афіцэр. Я усё зрабіў, як сумленны чалавек і калі маіх асьведчын не прынялі, мне застаецца толькі выехаць адгэтуль.

Альжбета — (*спалохаўшыся*) Вы, пан Крукоўскі, гэтага ня зробіце! Вы ня можаце кінуць Верачку гэтакай!

Крукоўскі — Але што-ж я зраблю, калі заместа мяне хочуць мець лепш якогась вясковага хлапца.

Альжбета — Гэта ня Верачка і ня я. Гэта стары. А Верачка вас так кахае. Казала, што жыць бяз вас ня можа.

Крукоўскі — Я таксама кахаю Верачку, але я ня бачу выхаду.

Альжбета — Як кінуць? Не, не... Барані Бог, вы гэтага ня зробіце! Вы гэтага ня можаце зрабіць!

Крукоўскі — А што-ж я павінен зрабіць?

Альжбета — Вы наўперад павінны ўратаваць Верачку ад ганьбы. Вы павінны, палюль ніхто нічога ня ведае, узяць з Верачкай шлюб.

Крукоўскі — Ну што-ж, я ня проч. Але вы ведаеце, што тут павянчацца мы ня зможам, а ў горадзе з цяпер не змагу пражыць з Верачкай, пакуль не найду службу.

Альжбета — Добра, добра, пан Крукоўскі! Я аб гэтым ужо думала. Я вам дам грошы. Колькі вам трэба? Кажыце?

Крукоўскі — (*думае*) На першыя патрэбы... На першы час... пакуль мы абжывёмся... хоць бы... Ну тысячу рублёў золатам.

Альжбета — Так многа! У нас толькі няма.

Крукоўскі — Вы знаеце, мамаша, як дорага жыцьцё у горадзе. Падругое мы-ж ня можам жыць, як якія жабракі. Вы кажаце, што у вас толькі няма? А колькі ў вас ёсьць?

Альжбета — Я-б магла даць вам пяць соцень... і то я бяру іх цішком ад старога.

Крукоўскі — Не, не, мамаша, з гэтакай сумай я баюся браць Верачку на сваю адказнасьць.

Альжбета — Ну шэсьць!.. (*бачачы яго кіслую міну*) Ну сем!.. Ну восемсот!..

Крукоўскі — (*з ірмасай*) Фі! мамаша, як у вас хапае духу таргавацца? Вы-ж усё гэта дасьцё Верачцы, а яна ў вас адна.

Альжбета — Так, пан Крукоўскі, але болей грошай няма, хоць зарэж?

Крукоўскі — Ну харашо, харашо, харашо, мамаша (*цалуе ёй руку*).

Альжбета — Але адно, сынок, ты мусіш прысягнуць мне, перад гэтым абразом (*паказвае на абраз*), што ня кінеш Верачку, што возьмеш з ёй шлюб?

Крукоўскі — Ці вы аж так моцна мне ня верыце? Але харашо, каб супакоіць вас, я на ўсё гатовы.

Альжбета — Дзякую, сынок! І няма чаго марудзіць. Каб часам і стары не надыйшоў, ды і цягнік надойдзе хутка.

Крукоўскі — Ваша праўда, мамаша! Дык я пайду найму вазьніка.

Альжбета — Што вы? І ня думайце. З гэтага аб усім можа дагадацца вёска. І нам змогуць перашкодзіць. Вы на'т і за рэчамі сваімі ня ідзеце да Язэпа. Потым мы вам іх вышлем. На'т і Верачка хай не бярэ шмат пакункаў. Я потым ёй усё прышлю, а грошы дам цяпер (*выходзіць у кухню*).

Зьява 11-я.

Крукоўскі адзін.

Крукоўскі — Якая разумная баба! Ну калі і дачка па ёй, то Іван Матвеіч павіншуй сябе з жонкай! Ды нічога! Усякіх мы бачылі? Быліб грошы! Грошы-б мне хутчэй, а з жонкай паглядзім. Толькі, каб не ашукала шэльма-баба! Але здаецца не адважыцца?

Зьява 12-я.

Крукоўскі і Верачка.

Верачка — Любы, ты прыйшоў?

Крукоўскі — Дарагая! Ці-ж ты магла прыпушчаць іншае?

Верачка — Ох, каб ты ведаў колькі

Кожны, хто бачыў гэты памятнік, вынес аб ім згоднае ўражаньне: просты, скромны — якім быў за жыцьця і сам паэт К. Сваяк — і аднак вельмі густоўны. Будзе гэта першы, а тымчасам і адзіны беларускі памятнік на Россах. Вартасьць жа гэтага памятніка тымбольшая ійшчэ і з тае прычыны, што паўстаў ён з усенародных складак. Памяць аб пазце злучыла беларусаў: каб-жа яна лучыла нас і на далей!

Далейшыя складкі на памятнік можна перасылаць на чэкавое конто П.К.О. № 180.485—(Вільня, інж. А. Клімовіч).

Адчыненьне памятніка Каз. Сваяку і Урачыстая Акадэмія. Як ужо паведамлялася ў сваім часе, урачыстае адчыненьне памятніка Сваяку адбудзецца ў суботу дня 6 чэрвеня сёл. а гадз. 6-ай веч. над магілай паэта на Літарацкай Горцы, на могілках Росса. Зараз пасьля адчыненьня памятніка адбудзецца ў залі пры Завальнай вул. № 1 Урачыстая Акадэмія, прысьвячаная памяці Сваяка. Уход на адчыненьне памятніка і на Акадэмію — вольны і бясплатны.

Лекцыя ў Віленскім Аддзеле БІГІК. У мінулую нядзелю 24 траўня сёлета ў залі Беларускага Інстытуту Гасп. і Культуры ў Вільні пры Завальнай вул. № 1 адв. М. Шкялёнак прачытаў навукова-папулярную публічную лекцыю аб копных судох на Беларусі.

Зборкі працаўнікоў над чысьцінёй беларускай мовы будуць стала адбывацца раз у тыдзень у кожную пятніцу, у памешканьні Беларускага Інстытуту Гасп. і Культуры ў Вільні пры Завальнай 1—1, а гадз. 18-тай.

Матуральныя экзаміны ў Віленскай Беларускай Гімназіі. 27 і 28 траўня сёл. кончыліся матуральныя экзаміны Беларускай Філіі дзярж. гімназіі ім. Ю Славацкага ў Вільні. Да экзамінаў агулам былі дапушчаны 26 вучняў гімназіі і 3 экстэрны. Пісьменных экзамінаў не здалі 4 чалавекі і вусных — 1. Да пісьменных экзамінаў не дапушчаны былі 4 чалавекі. Скончылі гімназію агулам 21 гадунец гімназіі і 3 экстэрны.

Прадчасныя вакацыі. Сёлета ў Беларускай Філіі дзярж. гімназіі ім. Ю. Славацкага заняткі кончыліся ўжо 30 траўня.

Z litoŭskaha žyćcia

Zmacniajecca ideja jednaści baltyckich narodaŭ. Litoŭskija hazety pišuć, što ŭ litoŭskim hramadzianstwie štoraz bolš zmacniajecca ideja jednaści baltyckich narodaŭ. Heta robicca praz roznyja sabrańni, narady, presu, školu, radyjo i h. p. Padobna robiać i inšyja baltyckija narody: łatwijcy i esty. U Litwie heta ideja prajaŭlaje imknieńnie žyć wiečna. Z hetaj metaj sioletniaj wiasnoj pa ŭsiej Litwie sadzili drewy jednaści Baltyki. Heta rabili školy i arhanizacyi. 14. V było pasadžana drewa bałtyckaj jednaści ŭ Koŭnie na placy Niezaležnaści. Drewa pasadziŭ ministr aświety praf. Tonkunas, a paświaciŭ jaho kun. W. Mironas. Pry hetaj nahodzie byŭ napisany adpawiedny akt, jaki padpisali ŭčaśniki hetaj uračystaści: litoŭski ministr zahraničnych spraŭ S. Łazarajtis, a tak-ža pradstaŭniki Łatwii i Estii. Akt heny pačynajecca slawami: „ideja jednaści baltyckich narodaŭ, što doŭha było latucieńniem, — siańnia stałasia sapraŭdnaściaj“.

U Koŭnie niama biezrabotnych. Pašla zimy ŭ Koŭnie i ŭ jaje pradmieściach uznoŭ ažywilasia budawańnie roznych damoŭ, jakoje wymahaje šmat rabotnikaŭ. Z hetaj pryčyny ciaper u Koŭnie susim niama biezrabotnych. Majuć rabotu jak intelihienty, tak i zwyčajnyja rabotniki. Dla biezrabotnych starajecca pracy birža pry samaŭradzie m. Koŭny. Litoŭskija hazety pišuć, što sioleta ad studzienia miesiaca da traŭnia hena birža pracy dała rabotu 5.542 biezrabotnym, u liku jakich 404 intelihienty.

•

Wysialeńnie litoŭcaŭ. „Viln. Ryt.“ (Nr. 41 siol.) padaje, što niadaŭna Wilenska-Trocki starasta wysieliŭ na try hady na 30 kilametraŭ ad administracyjnaj linii kiraŭnicu čytalni „Rytasa“, alkienickaj wołaści Moniku Kildišyte i W. Biekša.

Akademija ŭ češć św. p. dr. D. Alsejki adbudziecca 30.V a hadz. 7 min. 30 wiečaram. Akademiju ładzić t-wa „Kultura“.

Kanfiskata. Zahadam Starasty m. Wilni skanfiskawany Nr. 19 „Viln. Žodis“.

Dalej spyniajuć i zakrywajuć. „Viln. Ryt.“ (Nr. 42 siol.) piša, što apošnim časam administracyjnymi ŭładami ŭznoŭ spyniena i zakryta 15 addziełaŭ lit. t-wa św. Kazimiera.

З Украінскага жыцьця

Нацыяналістычная дзейнасьць у Савецкай Украіне. У папярэдніх нумарох „Бел. Крыніцы“ мы падавалі весткі аб нацыяналістычнай акцыі ў Адэсе і аб судовых працэсах, каторыя адбыліся, або маюць адбыцца над украінцамі за нацыяналістычную дзейнасьць.

Адзін з такіх палітычных працэсаў нядаўна адбыўся ў Харкаве над 12 асобамі, абвінавачанымі за прыналежнасьць да нацыяналістычнай арганізацыі. Савецкая газэта „Комуніст“ з 2.V сёлета піша, што ўсе гэныя падсудныя працавалі ў шахтах і калхозах, дзе пры помачы падробленых дакумантаў праводзілі нацыяналістычную акцыю. Акцыяй гэтай кіраваў праф. гімназіі Бардзічэнко, яго памоцнікам быў Гаркавенко, каторы пры помачы жонкі начальніка суду даставаў многа патрэбных для нацыяналістычнай арганізацыі дакумантаў, а нават пратаколаў суду. Як выказала сьледзтва, гэныя 12 падсудныя арганізавалі баёвыя аддзелы і дастаўлялі ім зброю. Мелі яны лучнасьць з усімі сябрамі нацыяналістычнай арганізацыі па вялікшых местах Украіны.

Суд засудзіў праф. Бардзічэнка і Гаркавенка на кару сьмерці, а ўсіх іншых на цяжкую катаргу ад 5 да 15 гадоў. Адзін з падсудных, Семірэнко, у часе выводжваньня засуджаных з судовай залі кінуўся на міліцыянэра і быў прабіты на сьмерць штыхамі двох міліцыянэраў.

10-тыя ўгодкі сьмерці С. Петлюры. Сёлета 23 траўня з 10-тыя ўгодкі сьмерці С. Петлюры ў Львове ў праваслаўнай царкве адбылася паніхіда за душу нябожчыка. На паніхідзе, апрача украінскага грамадзянства, былі прадстаўнікі цывільнай і вайсковай ўлады.

20-тыя ўгодкі сьмерці Івана Франка. Дня 28 г. м-ца мінула 20 гадоў пасьля сьмерці вялікага Украінца, сына Галіцкай Зямлі, вялікага паэта і пісьменьніка, Івана Франка. Украінцы з году ў год у м-цы траўні сьвяткуюць угодкі сьмерці Франка. Сёлета Франкаўскую гадавушчыну украінцы абходзяць — у 20-тыя ўгодкі— з большай ўрачыстасьцяй.

Шлюб Лэбэдзя з Гнаткіўскай. Дня 18 г. м. у Варшаўскай вастрожнай капліцы адбыўся шлюб ведамых з нядаўнага вялікага судовага працэсу за забойства міністра Перацкага Лэбэдз з Гнаткіўскай. Лэбэдз, як ведама, засуджаны на кару дасмяртнага вастрогу, Гнаткіўска на 15 гадоў вастрогу.

Pahroza wajny ŭ Eŭropie

Aružny napad Italii na Abisyniju i faktyčny razhrom hetaj adzinaj niezaležnaj dziaržawy ŭ Afrycy zradziŭ cely rad palityčnych zakałotaŭ u Zachodniaj Eŭropie.

Nia ŭśpieła krychu prycichnuć pahroza francuska-niamieckaj wajny, pašla zaniaćcia niamieckim wojskam Nadrenii, jak uznoŭ paŭstała pahroza anhielska-italijanskaj wajny.

Anhlija nia moža zhadzicca z imperyjalistyčnymi planami Italii, jakaja zawajawaŭšy Abisyniju, pahražaje kalanijalnaj anhielskaj palitycy ŭ Afrycy.

Spadziajučysia wajennaha kanfliktu miž Anhlijaj i Italijaj, jaki moža wyklikać nowuju suświetnuju wajnu, eŭrapejskija dziaržawy paśpiešna zbrojacca i arhanizujucca ŭ „fronty“ naładžwajučy swaje suadnosiny z druhimi dziaržawami.

Ahułam kažučy, sučasnaje žyćcio Eŭropy znachodzicca pad znakam zbrajeńnia, na jakoje nakirowanyja ŭsie kulturnyja, ekanamičnyja i techničnyja siły narodaŭ.

Na Dalokim Uschodzie

Pahroza wajny miž Japonijaj i Sawietami nia spyniajecca. Z pastupańnia japonskaha ŭradu wyhladaje, što Japonija pastupowa hatowicca da aružnaj raspraway z Sawietami. Japonija starajecca pierakanać Anhliju i Ameryku, što jana ichnich intaresaŭ na Dalokim Uschodzie nie narušyć i što japonskaje zbrajeńnie skirawana wyklučna tolki proci Sawietaŭ.

Japonskija hazety padajuć, što z Anhlijaj japonski ŭrad užo dahawaryŭsia, a ciapier iduć pierahawory z Amerykaj.

Kali-b hetyja dźwie dziaržawy sapraŭdy dali Japonii „wolnuju ruku“ na Dalokim Uschodzie, dyk tady zahrymieła-b wajennym hromam na Dalokim Uschodzie, jaki, mahčyma, byŭby čutny i ŭ našym krai.

я перацярпела за гэты час! Колькі перадумала! Думала, што ты ўжо расхахаў і пакінуў мяне.

Крукоўскі — Што за прыпушчэньні? Адваротна, калі мы растанемся, то не па маёй віне.

Верачка — Ты хочаш сказаць, што тата?..

Крукоўскі — Але, на'т забараніў мне прыходзіць у ваш дом.

Верачка —Але зразумей...(*перабіваючы*).

Крукоўскі — Так, так, я разумею і дзеля таго бачу толькі адзіны выхад.

Верачка — Які?

Крукоўскі — Як можна хутчэй уцякаць нам адсюль.

Верачка — Уцякаць?

Крукоўскі — Так. дарагая! гэта адзіны выхад, і калі ты запраўды мяне кахаеш, то павінна згадзіцца на гэта.

Верачка — Любы, я на ўсё згаджуся... Ты ведаеш, мне няма павароту, ані выбару. Але як мама?

Крукоўскі — Што тычыцца мамы, дык мы з часам забяром яе да сябе. Я з ёй ужо гаварыў, і яна згаджаецца з нашым плянам і на'т паможа нам грашыма на першыя патрэбы.

Зьява 13-я.

Тыя-ж і Альжбета.

Альжбета — Варушыцеся, варушыцеся, дзеткі! Хаця-б на цягнік пасьпелі. Ды каб і стары часам не вярнуўся. Верачка! Табе хіба пан Крукоўскі ўсе расказаў?

Верачка — Так, мама, і я згаджаюся. Толькі баюся аднаго — як-жа ты застанешся? Бо тата можа, хто ведае, што зробіць?

Альжбета — Ня бойся, дачушка, дасьць Бог, усё будзе добра. Я жывучы і ня гэта бачыла. Так што адным разам больш, адным—менш, усё роўна. Быві-б вы толькі шчасьлівыя.

Крукоўскі — (*цалуючы руку Альжбэты*) Мамаша, за шчасьце Верачкі я ручаюся! Ручаюсь, як бышы афіцэр, сваей чэсьцю!

Альжбета — Дзякую, сынок! На цябе і надзея ўся. А ты, Верачка, ідзі апранайся у дарогу, ды зьбяры штось неабходнае! (*Верачка выходзе ў свой пакой*).

Зьява 14-я.

Тыя-ж бяз Верачкі

Альжбета — Вось, сынок, (*паказывае вузялок*) гэта вам грошы... Восемсот, як адна капейка. аддам іх Верачцы, але ты ўперад прысягні. (*Паказвае на абраз*) Перад гэтым абразом прысягні, што возьмеш з ёй шлюб, што не кінеш яе?

Крукоўскі — Харашо, харашо, мамаша! (*падходзіць і станавіцца перад абразом на адно калена і палажыўшы руку на сэрца*).

На гэты сьвяты абраз Божай Мацеры, на Бога Усёмагутнага, на Сына Яго, распятага за нашыя грахі, Госпада Нашага! На ўсіх сьвятых угоднікаў прысягаю, што Верачка будзеш маёй жонкай. Прысягаю, як бышы афіцэр, аддаць усё за яе шчасьце (*жагнаецца— адначасна з ім і Альжбета*).(*Потым устае і падходзіць да Альжбеты і цалуе ізноў яе руку*) Ну што, мамаша, цяпер вы спакойны?

Альжбета (*узрушаная*) Так, так, сынок! Дай Бог вам шчасьце! (*цалуе яго ў галаву і робіць знак крыжа*).

Зьява 15-я.

Тыя-ж Верачка.

Верачка — (*у руках невялікі пакунак*) Я ўжо гатова! З сабой амаль нічога не бяру.

Альжбета — І добра робіш, дачушка! Я потым прышлю усё. Толькі пісьмо прышлiце. Я і грошы прышлю, як трэба будзе.

Крукоўскі — Добра, добра, мамаша, прышлём! А потым мы думаем з Верачкай забраць і вас да сябе.

Альжбета — Дзе ўжо мне на старасьць, а хто-ж старога дагледзіць? Жывіце ўжо вы здаровы ды шчасьлівы.

Верачка — Не, не, мама. забяром, абавязкава забяром.

Крукоўскі (*вярнуўшы на гадзіньнік*) Нам ужо час у дарогу, дарагая! (*да Альжбеты*) Затым дасьвіданьне, мамаша.

Верачка — Мама, мамачка! (*абнімае плачучы матку*) Мая родная!

Альжбета — (*плачучы*) Супакойся, супакойся, дачушка! Дасьць Бог, усё добрым кончыцца. Стары хоць і... кепскі, а усё-ж бацька і ў яго сэрца ёсьць — прабачыць, і ўсё добра будзе. А гэта вось табе на дарогу (*Верачка кладзе вузялок у кішэнь і цалуе руку матцы*).

Крукоўскі — Ня згубі толькі, дарагая!

Верачка — Мама, мамачка! хоць ты мне выбач усё! (*плача цалуючы рукі маці*).

Крукоўскі — Даволі, даволі, дарагая! Ідзём, а то запраўды спознімся.

Верачка — Хоць ты, мама, не запамінай мяне! (*выходзіць*).

Зьява 16-я.

Альжбета адна.

Альжбета — (*стаіць і плача*) Пайшлі!.. Што чакае яе?.. (*павірае ў вакно*) У ноч, у цёмную ноч выправіла! Сама выправіла... Яшчэ, амаль прасіла, каб узяў... Я!.. Я — матка, сваё дзіцянё... Глядзела!... гадавала.. ночак ня спала... сэрцам хварэла за яе... Выгадавела, вывесьцяла... і вось сама, сама выправіла ў ноч.. у сьвет... з чужым чалавекам. Яшчэ рада, што ўзяў, што ўзяў маё дзіцянё! Маю Верачку (*ідзе да абраза і становіцца на калені*). Матка Боская! За што? За што так цяжка караеш? Выбачай ёй! Хай міне яе крыж!

Дай ёй шчасьце!.. Лепш мяне пакарай, калі трэба гэта...

Заслона.

Кожны беларускі гаспадар-земляроб чытае адзіны беларускі гаспадарскі часапіс

„САМАПОМАЧ“

Часапіс выходзіць рэгулярна што месяц, зьмяшчае у сабе ўсякія гаспадарскія рады, весткі і каштуе з перасылкай на год толькі 3 зл. на паўгоду . . . . 1.75.
Адрас рэдакцыі: Вільня, Полацкая вул. 9—4.

Da Biełarusaŭ Katalikoŭ!

7 červienia sioleta, na św. Trojcu, adbudziecca biełaruskaja pilihrymka ŭ Kalwaryju kala Wilni.

Usich biełarusaŭ,jakija źbirajucca sioleta adwiedać hetak światoje miesca, zaklikajem dałučycca da biełaruskaj pilihrymki.

Treba prybywać u Wilniu na 6 červienia ŭ subotu. U hety dzień a hadzinie 6-taj wiečaram adbudziecca na wilenskich mohiłkach Rosa adkryćcie i paświačańnie pamiatnika nad hrobam biełaruskaha paeta Kazimiera Swajaka (Ks. K. Stepowiča).

Paśla hetaha ŭ zali Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury (Zawalnaja 1—1) adbudziecca ŭ čeść taho-ž paeta załobnaja Akademija.

Nazaŭtra, u dzień św Trojcy, u kaściele św. Mikałaja a hadz. 7 min. 30 św. Imša, paśla jakoj pracesija ŭ Kalwaryju.

Prybyŭšyja ŭ Wilniu źbirajucca ŭ zali Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury (Zawalnaja 1—1), adkul buduć raźmieščany pa pryhatawanych dla pilihrymaŭ kwaterach.

Wilnia, 7.V.1936. **Biełaruski Kaścielny Kamitet**

Roznyja wiestki

Z POLŠČY

Nowaja partyja. Paśla razwału B.B., jaki mieŭ być biespartyjnaj arhanizacyjaj, na jaho ruinach tworacca nowyja partyi. Z byłych siabroŭ B.B. niadaŭna paŭstała nowaja partyja h. zw. „Polski Front", katoraj orhanam źjaŭlajecca hazeta „Naród i Państwo". Hetaja partyja maje być centram dzieła roŭnawahi ŭradawaj „lewicy" i ŭradawaj prawicy.

Niamieckaja prapahanda praciŭ Gdyni. Polskija hazety pišuć, što niamieckija čyhunki wiaduć u Čechasławaččynie ahitacyju suproć polskaha portu Gdyni i starajucca ŭwieś eksport českich tawaraŭ abminajučy Gdyniu škirawać u niamieckija party — Hamburg i Ščecin. Dziela hetaha robiać specyjalnyja čyhunačnyja źnižki. Hetaja niamieckaja prapahanda nadta škodnaja dla interesaŭ Gdyni, jakaja dobra zarablaje na tranzakcyi českich tawaraŭ.

Strajk u Lwowie. U minułym tydni wybuch u Lwowie wialiki strajk haradzkich rabotnikaŭ, z pryčyny jakoha tramwai i niekatoryja haradzkija mechaničnyja ŭstanowy stajali niačynnyja, a elektroŭnia i hazoŭnia byli absadžany inžyniarami i majstrami.

Milijon złotych na budowu škoł. Niadaŭna ŭ ministerstwie aświety adbyłasia konferencyja, na jakoj pastanoŭlena zrealizawać plan budowy 100 pačatkawych škoł im. maršała Piłsudskaha ŭ Wilenskim wajawodztwie. Na hetuju budowu ministerstwa aświety praznačyła 1 milijon złotych. Prajektujecca pabudawańnie prynamsia pa adnej škole ŭ kožnaj wołaści Wilenskaha wajawodztwa, razam z pamieškańniem dla wučycialoŭ.

Antykamunistyčny ruch. Hazety padajuć: u chutkim časie ŭwa ŭsich wajawodztwach buduć utworany specyjalnyja kamitety, jakija zajmucca arhanizacyjaj supolnaha antykamunistyčna frontu u Polščy. Zadačaj hetaj nowaj arhanizacyi maje być wiadzieńnie šyrokaj antykamunistyčnaj prapahandy. Da hetaha frontu buduć mieć mahčymaść naležać roznarodnyja arhanizacyi. U pracy antykamunistyčnaha frontu buduć mieć učaście tak-ža apozycyjnyja palityčnyja dziejačy.

Z ZAHRANICY

Baraćba arabaŭ z žydami ŭ Palestynie pradaŭžajecca. Užo dwa tydni minuła, jak u Palestynie araby wiaduć baraćbu suproć žydoŭ. Hetaja baraćba dalej pradaŭžajecca i zawastrajecca. Anhlija ŭzmocniła swaje wajskowyja harnizony ŭ Palestynie, jakija starajucca siłaj zdušyć bunt arabaŭ. Žydy pakidajuć staryja kwartały Irusalema. Aryštawana 1.000 arabaŭ i bolš 50 žydoŭ.

Abisyncy dabrawolna nie paddajucca italijancam. Italijancy, zaniaŭšy stalicu Abisynii Addis Abebu, zmušajuć astatki raźbitaha abisynskaha wojska paddacca pad ichniuju ŭładu. Ale abisyncy dabrawolna nie zdajucca. Časta dachodzić da krywawych sutyčak italijanskaha wojska z abisyncami. Abisyncy niadaŭna padpalili latunskuju stancyju ŭ Desije. Italijancy žorstka raspraŭlajucca z apornymi abisyncami. Dnia 23 traŭnia ŭ Addis Abebie italijancy rastralali 20 abisynskich aficeraŭ prybočnaj hwardyi nehusa.

Abisyncy arhanizujuć abaronu swajho kraju pierad italijanskaj akupacyjaj. Hazety padajuć cikawyja wiestki ab nowaj arhanizacyi abisyncaŭ suproć italijanskich najezdnikaŭ. Niekalki abisynskich ministraŭ, paśla wyjezdu nehusa, uciakli ŭ harystuju paŭdniowa-zachodniuju častku Abisynii i tam abwieścili miesta Hore nowaj stalicaj niezaležnaj Abisynii. Tudy pierawiezieny amal usie dziaržaŭnyja archiwy i tam uzialisia za arhanizacyju nowaha abisynskaha kiraŭnictwa, na čale z rasam Abrahamam. U nowaj abisynskaj stalicy arhanizujecca tak-ža nowaja abisynskaja armija, jakaja pawiadzie dalejšuju baraćbu z italijancami.

U nowaj stalicy Hore narmalna funkcyjanuje abisynskaja radjo-stancyja, praz jakuju adtul abisyncy pazdraŭlajuć swajho nehusa.

Anhlija nia pryznaje italijanskaj aneksyi Abisynii. Niadaŭna anhlijski ministr Sajmon na pasiedžańni anhlijskaha parlamentu ŭ sprawie zawajawańnia italijancami Abisynii zajawiŭ, što Anhlija ŭważaje Abisyniju i dalej suwerennaj dziaržawaj, a italijancaŭ za akupantaŭ jaje bolšaj častki.

Baraćba hitleryzmu z katalicyzmam u Niamieččynie. Hitler abwieściŭ zmahańnie nia tolki z žydami, ale tak-ža i Katalickim Kaściołam. Ciapier u Niamieččynie šyrycca neopahanstwa. Isnuje tam kala 10 arhanizacyjaŭ, jakija specyjalna wiaduć akcyju suproć katalickaj relihii i tworać nowuju nacyjanalnuju niamieckuju neopahanskuju relihiju. Adzin z pawadyroŭ takoj arhanizacyi praf. Haŭer skazaŭ, što „nijakich kaściołaŭ, nijakich ksiandzoŭ nia treba. Šukajem praŭdziwaj učuciowaści, jakoje štodzień adnaŭlajučy, zrabiła-b nas roŭnych Bohu. Platona, Schillera, Nietsche — staŭlajem wyšej Chrysta".

— Druhi niamiecki pawadyr antychryścijanskaj sekty pojšoj dalej za henaha i haworyć, što ichnim relihijnym ideałam jość niamieckaja rasa. Pawodle jaho, niemcy pawinny ciešycca z taho, što jość niemcami, a hetaja radaść pawinna zamianić im usiakuju relihiju.

Jak bačym, hitleryzm choča z nacyjanalnaha pačućcia niamieckaści stwaryć nowuju relihiju, a skasawać katalicyzm i protestantyzm. Treba adznačyć, što hitleroŭcy ŭ baraćbie z Katalickim Kaściołam uspamahajuć roznyja inšyja, warožyja katalicyzmu, sekty, jakich ciapier u Niamieččynie płodzicca nadta mnoha.

Śnieh u pałowie traŭnia. Hazety padajuć, što na pačatku druhoj pałowiny traŭnia sioleta nastupiŭ ŭwa ŭsiej siaredniaj Eŭropie, uschodniaj Ukrainie i ŭschodniaj Rasiei raptoŭny choład z prymarazkami, śnieham i hradam. U Rasiei wypali takija śniahi, što ludzi pačali na't jeździć sańmi Hety choład adbiŭsia tak-ža častkowa i na paŭdniowa-ŭschodnich, ukrainskich ziemlach.

З жыцьця ў СССР.

Сялянскі процінаступ.

Пад гэтакім загалоўкам б. карэспандэнт „Gazety Polskiej", Отмар, у Маскве напісаў газэтны артыкул, у якім, між іншым, піша гэтак:

Спыненьне барацьбы між савецкім рэжымам і многамільённымі сялянскімі масамі, якое наступіла ў лютым мін. году пасьля кангрэсу колектыўных прадстаўнікоў у Маскве, апіраецца на ўступках для сялян. Наданьне „калхозам" зямлі „на вечную ўласнасьць," дазвол мець прыватна карову і некалькі штук іншай скаціны, права на ўласны агарод, наданьне колектывам характару коопэратываў і адступленьне ад „колектываў камуністычных"—гэта былі ўступкі для сялян.

Разумецца, гэта быў стан праўны, а не фактычны. Цяпер бальшавікі вядуць барацьбу з „без кароўем," але безрэзультатна... Зялёны сялянскі сьцяг і чырвоны сьцяг ураду боруцца далей. Сяляне ненавідзяць рэквізыцыі збожжа. Сяляне сеюць збожжа, бо спадзяюцца, што незадоўга будуць яго і зьбіраць толькі для сябе, але ня ведаюць калі той шчасьлівы дзень настане. Вера сялян у іхняю перамогу над колектывамі нічым ня зломана. Сяляне ня хочуць паваroту паноў (абшарнікаў), проціў якіх будуць бароцца заядлей чымся проціў камуністаў, але сяляне хочуць прыватнай уласнасьці.

Перамога рэлігіі.

Француская прэса падае: савецкая ўлада стварыла спэцыяльную камісію, якая аб'яжджае раёны СССР і дасьледжвае надужыцьці ў антырэлігійнай барацьбе з боку камуністаў. Гэтая камісія мае забясьпечыць свабоду выконваньня рэлігійных практыкаў тым грамадзянам, якія ёсьць рэлігійныя.

Гэтая камісія дасьледжвае такжа патрэбу царкоўных званоў. Паводле францускай прэсы, савецкія ўлады асыгнавалі пэўную суму грошай дзеля адліўкі новых царкоўных званоў, бо ў гадох рэвалюцыі многа званоў расплаўлена.

Паварот да сям'і.

Польская газэта „ABC" падае: у Саветах у апошнія часы выступае тэндэнцыя зьмены дасюлешніх адносінаў дзяржавы да сям'і.

Праўда, далей існуе свабода разводаў, але ўсіленая прапаганда сярод жанчын за сямейны зьвязак дае рэзультаты — амаль кожнае маладое жанімства самі жаніхі дабравольна рэеструюць і гэты факт трэбуюць упісываць у пашпарты. На бацькоў, якія не даглядаюць сваіх дзяцей, або іх выракаюцца, улада накладае вялікія кары. Нядаўна выданы новы закон у справе апекі на сіротамі, які на супроць дасюлешняй тэорыі і практыкі, загадвае аддаваньне сірот на выхаваньне сем'ям.

„Przegląd Artystyczny" i P. Sierhijewič

„Przegląd Artystyczny" — heta nazoŭ miesiačnaha ilustrawanaha polskaha časapisu dla spraŭ teatru, muzyki, mastactwa, litaratury, radyjo i filmu, jaki wychodzić užo 7 hod u Wilni. Charaktar henaha časapisu pawažny, apolityčny i wydajecca jon salidna. Apošnimi časami časapis heny pačaŭ źmiaščać wiestki z žyćcia bieł. mastakoŭ. U numary 3 „Przeg. Art" sioleta byŭ nadrukawany artykuł ab biełaruskim mastaku P. Sierhijewiču, a tak-ža byŭ reprodukawany jahony abraz: „Kastuś Kalinoŭski". U apošnim-ža ŭznoŭ numary „Prz. Art." źmieščana reprodukcyja abrazu „Padarožnyja" taho-ž našaha mastaka P. Siarhijewiča na pačesnym, reprezentatyŭnym, pieršym miescy. što jasna, jość dla P. Sierhijewiča nie aby jakim honaram.

„Biełaruskaja Krynica" ŭ m-cy červieni wyjdzie 10, 20 i 30.

Пісьмы з вёскі

Народны дом і беларуская школа.
(*З Мядзёльскай вол.*).

Сяляне Мядзёльскай воласьці пераважна малазямельныя і нацыянальна маласьведамыя. Праўда, некаторыя чытаюць нават „Беларускую Крыніцу" і другія беларускія часапісы, але ніякай дзейнасьці на беларускай адраджэнскай ніве не праяўляюць і ніякай культурна-асьветнай працы не вядуць.

У сувезі з гэтым я хачу парушыць тут справу народнага дому. У ваколіцы некалькі вёсак, Мядзёльскай воласьці, ёсьць адпаведны на прасьветную працу дом, калішняя воласьць, які сяляне пабудавалі супольнымі сіламі нашае воласьці. Рада Валасная падобна пастанавіла цяпер, каб гэны дом разабраць, перарабіць і фактычна няведама, што з яго зрабіць. Ваколічныя сяляне павінны на гэта адпаведна зарэагаваць — перадусім не пазволіць псаваць гэнага будынку, а дамагацца дазволу на тое, каб ён быў Народным Домам, у якім можна было-б праводзіць беларускую культурна-асьветную працу. Такжасама павінны сяляне дамагацца залажэньня беларускай школы. Памятайма, што толькі родная школа разьвее цемру, у якой марнуецца нашая моладзь, каторая займаецца часта разбоямі і пасьля іх ідзе ў вастрог. Родная школа бліжэй сэрцу беларускага дзіцяці. Родная школа зможа лепш узгадаваць беларускіх дзетак на добрых, сыноў свайго народу.

Дык змагаймася за родную школу! **Сьвядомы.**

Беларускае прадстаўленьне.

Бадзені, Жоснянскай вол. Моладзь вёскі Бадзені зладзіла 30.IV сёлета беларускае прадстаўленьне, у часе якога была адыграна „Паўлінка." Людзей на прадстаўленьні было многа і на ўсіх іх роднае слова са сцэны зрабіла вялікае ўражаньне. П'есу адыгралі артысты-аматары добра, за гэта ім хай будзе чэсьць і слава. Нашай моладзі жадаю памыснасьці ў працы на карысьць беларускага народу.

Адначасна заклікаю ваколічную беларускую моладзь пайсьці сьледам нашай моладзі, ладзіць беларускія прадстаўленьні, зацікаўленьне якімі ў нас вельмі вялікае, весьці культурна-асьветную працу агулам і будаваць сабе лепшае жыцьцё. **Блізкі.**

Damahajmasia biełaruskaj mowy ŭ światyniach.

Murawana-Ašmianka, Ašmianskaha paw. U nas usie biełarusy-kataliki, ale zusim niaświedamyja i dziela hetaha časta pamyłkowa ličać siabie „polskaj wiery." Woś-ža treba, kab našyja ludzi raz na zaŭsiody zapamiatali sabie, što nijakaj „polskaj wiery" niama, a jość wiera katalickaja, prawasłaŭnaja i inš. Katalickaść i polskaść heta dwa zusim roznyja paniaćci, jakija na našych ziemlach polskija nacyjanalisty dla swaich palityčnych metaŭ časta starajucca ŭtažsamić. Biełarusam-katalikom treba dobra adroźniwać henyja dwa paniaćci i rašuča suproćstawicca polonizacyi, šyranaj ŭ nas razam z katalictwam.

15 traŭnia sioleta ŭ Ašmianskaj parachwii byŭ z wizytacyjaj arcybiskup Jałbžykoŭski, a tak-ža było niekalki ksiandzoŭ z susiednich parachwijaŭ. Pryjaždžaŭ arcybiskup i da nas. Ksiondz naš zdaŭ arcybiskupu sprawazdaču z swajej dziejnaści, a paśla jak pačali zdawać sprawazdačy i prasić biskupskaha bahasławienstwa ŭsie arhanizacyi, relihijnaha charaktaru, jak ad Akcyi Katalickiej, Bractwa Ćwiarozaści, z Apostalstwa Malitwy, z K.S.M. i inš., trudna ŭsich na't zapamiatać, dyk prajšło bolš času, čymsia na kryžmawańni i malitwach u kaściele. Biskup nadta ciešyŭsia z swaich arhanizacyjaŭ, bolš čymsia z swaich awiečak naahuł. Ksiandzy hawaryli kazańni, ale, na žal, niwodzin z ich nie skazaŭ u našaj rodnaj mowie.

Darahija parachwijanie, pratryma zaspanyja ad ciažkoha snu wočy i damahajmasia swajej rodnaj mowy ŭ światyniach! *Dziadźka Raman.*

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič